# ЭТЫЧНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ
# АХОВЫ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Этычныя прынцыпы аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны былі сфармуляваныя ў духу Канвенцыі аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны, прынятай у 2003 г., і наяўных міжнародных нарматыўных дакументаў, якія прадугледжваюць абарону правоў чалавека і правоў карэнных народаў. Яны ўяўляюць сабой набор ўсёабдымных амбіцыйных прынцыпаў, якія шырока прызнаюцца ў якасці передавой практыкі для ўрадаў, арганізацый і асобных людзей, якія маюць прамое або ўскоснае дачыненне да нематэрыяльнай культурнай спадчыны, з мэтай забеспячэння жыццяздольнасці такой спадчыны, тым самым прызнаючы яе ўклад ва ўстойлівы свет і ўстойлівае развіццё. Разам з Канвенцыяй аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны, Аператыўным кіраўніцтвам па выкананні Канвенцыі і палажэннямі нацыянальных заканадаўстваў гэтыя этычныя прынцыпы павінны служыць агульнай базай для распрацоўкі спецыяльных кодэксаў этыкі і інструментаў, адаптаваных да мясцовых умоў і патрабаванняў пэўных сектараў.

1) Супольнасці, групы і, у адпаведных выпадках, асобныя людзі павінны адыгрываць галоўную ролю ў ахове іх уласнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

2) Правы супольнасцяў, груп і, ў адпаведных выпадках, асобных людзей працягваць звычаі, формы ўяўлення і выяўлення, веды і навыкі, неабходныя для забеспячэння жыццяздольнасці нематэрыяльнай культурнай спадчыны, павінны прызнавацца і паважацца.

3) Узаемная павага, таксама як і павага і ўзаемнае прызнанне нематэрыяльнай культурнай спадчыны, павінны мець пераважную ролю ва ўзаемаадносінах паміж дзяржавамі, а таксама паміж супольнасцямі, групамі і, у адпаведных выпадках, асобнымі людзьмі.

4) Усе ўзаемаадносіны з супольнасцямі, групамі і, у адпаведных выпадках, асобнымі людзьмі, якія з'яўляюцца стваральнікамі і носьбітамі гэтай спадчыны і забяспечваюць яе перадачу, павінны ажыццяўляцца праз транспарэнтнае супрацоўніцтва, дыялог, перамовы і кансультацыі пры ўмове іх вольнай, папярэдняй, бесперапыннай і інфармаванай згоды.

5) Дасяг супольнасцяў, груп і асобных людзей да дакументаў, прадметаў, артэфактаў, культурнай і прыроднай прастораў і памятных мясцін, існаванне якіх неабходнае для выяўлення нематэрыяльнай культурнай спадчыны, павінны быць забяспечаны, у тым ліку ва ўмовах збройнага канфлікту. Агульнапрынятыя практыкі, якія вызначаюць дасяг да нематэрыяльнай культурнай спадчыны, павінны выконвацца, нават у тым выпадку, калі яны абмяжоўваюць дасяжнасць гэтай спадчыны для грамадскасці.

6) Кожная супольнасць, група або асобны чалавек павінны вызначыць каштоўнасць іх уласнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны, і гэта нематэрыяльная культурная спадчына не падлягае вонкавай каштоўнаснай адзнацы.

7) Супольнасці, групы і асобныя людзі, якія з'яўляюцца стваральнікамі нематэрыяльнай культурнай спадчыны, павінны карыстацца абаронай маральных і матэрыяльных інтарэсаў, якія ўзнікаюць у сувязі з такой спадчынай, і, у прыватнасці, у сувязі з яе выкарыстаннем, дакументаваннем, даследаваннем, папулярызацыяй і адаптацыяй супольнасцямі ці іншымі асобамі.

8) Неабходна паважаць дынамічны і жывы характар нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Аўтэнтычнасць і ўнікальнасць не павінны выклікаць асцярогі ці з'яўляцца перашкодамі ў ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

9) Супольнасці, групы, мясцовыя, нацыянальныя і транснацыянальныя арганізацыі і асобныя людзі павінны старанна ацаніць простыя і ўскосныя, кароткатэрміновыя і доўгатэрміновыя, патэнцыйныя і канчатковыя наступствы любых дзеянняў, якія могуць паўплываць на жыццяздольнасць нематэрыяльнай культурнай спадчыны або супольнасцяў, якія з'яўляюцца яе носьбітамі.

10) Супольнасці, групы і, у адпаведных выпадках, асобныя людзі павінны адыгрываць істотную ролю ў вызначэнні небяспекі, якая пагражае іх нематэрыяльнай культурнай спадчыне, у прыватнасці, яе дэкантэкстуалізацыю, камадыфікацыю, скажэнне інфармацыі пра яе, а таксама ў прыняцці рашэнняў аб тым, як не дапусціць ці змякчыць гэтыя небяспекі.

11) Неабходна цалкам паважаць культурную разнастайнасць і самабытнасць супольнасцяў, груп і асобных людзей. У адпаведнасці з каштоўнасцямі, якія вызнаюцца супольнасцямі, групамі і асобнымі людзьмі, і захаваннем культурных норм, неабходна надаваць асаблівую ўвагу гендэрнай роўнасці, удзелу моладзі і павазе этнічнай самабытнасці пры распрацоўцы і ажыццяўленні мер па ахове.

12) Ахова нематэрыяльнай культурнай спадчыны мае агульнае значэнне для чалавецтва і таму павінна ажыццяўляцца на аснове супрацоўніцтва на двухбаковым, субрэгіянальным, рэгіянальным і міжнародным узроўнях.

Разам з тым супольнасці, групы і, ў адпаведных выпадках, некаторыя асобы не могуць быць адчужаныя ад іх уласнай нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

*Пераклад Алены Ляшкевіч*

*Ethics and Intangible Cultural Heritage*

*https://ich.unesco.org/en/ethics-and-ich-00866*